Кафедра сучаснай беларускай мовы

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА

# (МАРФАЛОГІЯ)

Назаранка Юлія Віктараўна

Вучэбна-метадычны комплекс

для студэнтаў 3 курса спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія”

завочнай формы навучання(5-6 семестры)

Мінск 2012

**Змест**


1. Прадмова.
2. Тэматыка лекцый.
3. Тэматыка практычных заняткаў.
4. Пытанні да заліку.
5. Экзаменацыйныя пытанні.
6. Спіс літаратуры.

# 1. Прадмова.

### Тлумачальная запіска

Курс сучаснай беларускай мовы арыентуе выкладчыка на вытлумачэнне з’яў беларускай мовы ў іх структурна-семантычным і функцыянальна-камунікатыўным аспектах, на выяўленне адметных спецыфічных заканамернасцей, якія праяўляюцца на розных узроўнях беларускай мовы, на ўсебаковае вывучэнне беларускай мовы як жывой і рухомай з’явы, дапамагае зразумець яе дынаміку і асноўныя тэндэнцыі развіцця. Метадалагічная база курса мае на мэце правільную і навукова абгрунтаваную прэзентацыю звестак тэарэтычнага характару, скарэкціраваную з улікам ідыяэтнічнага нацыянальнага кампанента беларускай мовы, характару і форм яе сувязей з іншымі мовамі, найперш роднаснымі славянскімі.

На лекцыйных і практычных занятках студэнты набываюць, засвойваюць і паглыбляюць веды па марфалогіі сучаснай беларускай мовы ў такой ступені, каб усведамляць яе як грамадскую з’яву і пэўную семіятычную сістэму і дасканала валодаць яе сродкамі.

Выкарыстоўваючы прынцып пераемнасці і ўзаемасувязі лінгвістычных дысцыплін, выкладчык павінен адбіраць такія факты і з’явы, якія ўсталяваліся ў навуцы аб мове, лічацца стрыжнёвымі для разумення іншых пытанняў і з’яўляюцца важнымі для пашырэння агульнага моўнага дыяпазону студэнтаў. Метады выкладання матэрыялу могуць быць розныя: яны, як правіла, залежаць ад складанасці тэмы і ступені падрыхтаванасці студэнтаў. Пэўную ўвагу неабходна звяртаць на тыя пытанні, якія адносяцца да дыскусійных або ўносяць новае ў асвятленне асобных фактаў мовы.

Практычныя заняткі праводзяцца па тэмах, якія вызначаюцца выкладчыкам і зацвярджаюцца на кафедры. Іх мэта – замацаваць і паглыбіць тэарэтычныя веды. Методыка правядзення практычных заняткаў розная: індывідуальнае, франтальнае, паслядоўна-лінейнае або выбарачнае апытванне; выкананне практыкаванняў на дошцы; работа па гатовых табліцах і схемах; выкананне тэставых заданняў і тэстаў на камп’ютэрах, праслухоўванне і аналіз разнастайных лінгвістычных запісаў і г.д. Правільна арганізаваная сістэма практычных заняткаў спрыяе выпрацоўцы ў студэнтаў самастойных навуковых поглядаў на моўныя з’явы і працэсы, дапамагае ім грунтоўна авалодаць нормамі літаратурнай мовы, паскарае набыццё навыкаў самастойнага аналізу моўных з’яў і фактаў.

Важнае значэнне ў працэсе засваення і замацавання ведаў і навыкаў мае лінгвістычны аналіз слоў, словазлучэнняў і сказаў. Для таго, каб лінгвістычны аналіз стаў сапраўдным эфектыўным навучальным сродкам, выкладчык павінен зыходзіць з адзіных навукова-метадычных прынцыпаў, сістэмнасці і строгай паслядоўнасці тлумачэння моўных з’яў. У залежнасці ад задач, якія ставяцца ў кожным канкрэтным выпадку, лінгвістычны аналіз можа быць вусным ці пісьмовым, частковым ці поўным.

Змест і задачы курса скіраваны на тое, каб сфарміраваць у студэнтаў правільныя навуковыя погляды на ўсю складаную сістэму сучаснай беларускай мовы, дапамагчы ім авалодаць яе літаратурнымі нормамі, набыць устойлівыя навыкі самастойнага аналізу лінгвістычных фактаў і з’яў, удасканаліць сістэму звязнага маўлення, пастаянна павышаць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць.

У выніку вывучэння марфалогіі **студэнты павінны ведаць**:

- асноўныя тэрміны, паняцці і катэгорыі марфалогіі;

- умовы і формы моўнай камунікацыі;

- літаратурныя нормы сучаснай беларускай мовы;

Павінны **ўмець**:

- валодаць вуснай і пісьмовай разнавіднасцямі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

- карыстацца асноўнымі паняццямі і тэрмінамі марфалогіі ў іх сістэмна-структурных сувязях;

- карыстацца асноўнымі метадамі лінгвістычнага аналізу;

- валодаць методыкай рэферыравання тэксту і яго перакладу на беларускую мову.

## 2.Тэматыка лекцый

**Лекцыя 1**

**Марфалогія як частка граматыкі. Часціны мовы.**

1. Марфалогія як раздзел граматыкі, яе прадмет і задачы.
2. Сувязь марфалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства.
3. Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі: граматычная форма, граматычны спосаб, граматычны сродак, граматычнае значэнне і граматычная катэгорыя.
4. Асноўныя спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў у беларускай мове. Класіфікацыйныя (лексіка-граматычныя) і словазмяняльныя граматычныя катэгорыі. Класіфікацыя граматычных катэгорый паводле тыпаў апазіцый граматычных значэнняў: бінарныя і небінарныя, эквіпалентныя і прыватыўныя катэгорыі.
5. Прынцыпы і крытэрыі аб’яднання слоў у лексіка-граматычныя класы – часціны мовы. Анамасіялагічны, навуковы і дыдактычны падыходы да выдзялення часцін мовы.
6. Сістэма часцін мовы ў сучаснай беларускай мове.
7. Спрэчныя пытанні класіфікацыі часцін мовы.
8. Пераходныя з’явы ў сістэме часцін мовы.

**Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў**

| | |
|---|---|
| Граматычны сродак | Лексіка-граматычны разрад |
| Граматычная форма | Лексіка-граматычная група |
| Граматычны паказчык | Граматычная катэгорыя |
| Словаформа | Поўная, няпоўная, збыткоўная парадыгма |
| Граматычнае значэнне | Бінарныя/небінарныя граматычныя апазіцыі |
| Лексічнае значэнне | Эквіпалентныя , прыватыўныя граматычныя апазіцыі |

Літаратура:


1. Беларуская граматыка. У 2 ч. Ч.1. Мінск, 1985.
2. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
3. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.


**Лекцыя 2**

**Назоўнік як часціна мовы.**

1. Семантыка-камунікацыйная адметнасць і граматычныя асаблівасці назоўніка як носьбіта агульнага значэння прадметнасці.
2. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў як адлюстраванне ўзаемасувязі лексікі і марфалогіі, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці.
3. Сістэма граматычных катэгорый назоўніка.

4. Катэгорыя ліку назоўнікаў. Значэнне і сродкі выражэння лікавага супрацьпастаўлення.
5. Катэгорыя склону назоўнікаў. Сістэма склонаў назоўнікаў у сучаснай беларускай мове.
6. Скланенне назоўнікаў. Асноўныя тыпы скланення назоўнікаў.
7. Праблема кадыфікацыі склонавых канчаткаў назоўнікаў.

## Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў

| | |
|---|---|
| Род назоўніка (м.,ж.,н. р.; агульнага роду) | Рэчыўныя назоўнікі |
| Лік назоўніка (адз. л., мн. л.), парны лік | Асабовыя/неасабовыя назоўнікі |
| Сістэма склонаў назоўніка | Адушаўлёныя/недушаўлёныя назоўнікі |
| Тыпы скланенняў назоўніка | Адзіночналікавыя назоўнікі |
| Агульныя/ Уласныя назоўнікі | Множналікавыя назоўнікі |
| Лексіка-граматычныя разрады назоўніка | Субстантывацыя |
| Абстрактныя/ Канкрэтныя назоўнікі | Зборныя назоўнікі |
| Нескланяльныя назоўнікі | Рознаскланяльныя назоўнікі |

Літаратура:


1. Наркевіч, А.І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. Мінск, 1976.
2. Жыдовіч, М.А. Назоўнік у беларускай мове / М.А. Жыдовіч. Мінск, 1969.
3. Граматычны слоўнік назоўніка/НАН Беларусі. – Мн.,2008.

4. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
5. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.


## Лекцыя 3

**Прыметнік як часціна мовы.**

1. Прыметнік як часціна мовы. Семантыка-камунікатыўная адметнасць і граматычныя катэгорыі прыметніка як носьбіта непрацэсуальнай прыметы.
2. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў: якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя формы.
3. Поўныя і кароткія формы якасных прыметнікаў, іх ужыванне і сінтаксічная роля. Сцягнутыя (усечаныя) формы прыметнікаў і іх роля ў мастацкім тэксце.
4. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх значэнне, утварэнне, адметнасць ужывання.

## Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў

| | |
|---|---|
| Ад’ектывацыя | Адносныя прыметнікі |
| Якасныя прыметнікі | Формы ступеняў параўнання прыметнікаў |
| Прыналежныя прыметнікі | Сінтэтычная і аналітычная формы ступеняў параўнання |

Кампаратыў
Поўная, кароткая і сцягнутая форма прыметніка
Нескланяльныя прыметнікі
Суперлятыў
Род, лік, склон прыметніка

Літаратура:

1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
2. Булахаў, М.Г. Прыметнік у беларускай мове / М.Г. Булахаў. Мінск, 1964.
3. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.

## Лекцыя 4

**Лічэбнік як часціна мовы.**

### Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў

Колькасныя лічэбнікі
Зборныя лічэбнікі
Парадкавыя лічэбнікі
Састаўныя лічэбнікі
Дробавыя лічэбнікі
Складаныя лічэбнікі
Простыя лічэбнікі
Скланенне лічэбнікаў

1. Семантычныя асаблівасці і спецыфіка граматычных катэгорый лічэбнікаў як слоў з колькасна-лікавым значэннем.
2. Разрады лічэбнікаў паводле значэння. Колькасныя (уласнаколькасныя і зборныя) лічэбнікі, асаблівасці іх сінтаксічнай спалучальнасці з назоўнікамі. Дробавыя лічэбнікі, іх семантычныя і структурныя асаблівасці. Пытанне аб парадкавых лічэбніках і іх месцы ў сістэме часцін мовы, асаблівасці семантыкі і ўтварэння. Няпэўнаколькасныя словы.
3. Разрады лічэбнікаў паводле будовы. Простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі, іх структура.
4. Скланенне лічэбнікаў розных разрадаў.
5. Асаблівасці выкарыстання лічэбнікаў у кантэксце.
6. Ужыванне лічэбнікаў у ролі іншых часцін мовы.

Літаратура:

1. Вярхоў, П.В. Лічэбнік у беларускай мове (параўнальна з рускай і ўкраінскай мовамі) / П.В. Вярхоў. Мінск, 1961.
2. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
3. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.

## Лекцыя 5

**Займеннік як часціна мовы.**

### Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў

Адмоўныя займеннікі
Асабовыя займеннікі
Займеннікі-назоўнікі
Займеннікі-прыметнікі
Пранаміналізацыя
Пытальна-адносныя займеннікі
Прыналежныя займеннікі
Указальныя займеннікі

| | |
|---|---|
| Займеннікі-прыслоўі | Азначальныя займеннікі |
| Зваротны займеннік | Няпэўныя займеннікі |

1. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць займеннікаў як слоў-“замяняльнікаў”, “указальнікаў”. Пытанне аб месцы займеннікаў у сістэме часцін мовы.
2. Тэрмін “займеннік” як сумяшчэнне двух значэнняў гэтага разраду слоў: лексічнага і функцыянальнага.
3. Роля займеннікаў у лагічнай і сінтаксічнай арганізацыі тэксту.
4. Семантычная класіфікацыя займеннікаў. Разрады займеннікаў паводле лексічнага значэння: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя, няпэўныя (неазначальныя).
5. Марфалагічная класіфікацыя займеннікаў. Разрады займеннікаў паводле суадносін з іншымі часцінамі мовы.
6. Скланенне займеннікаў розных разрадаў. Варыянты склонавых форм займеннікаў.
7. Вытворнасць / невытворнасць займеннікаў.
8. Пераход іншых часцін мовы ў займеннікі. Пранаміналізацыя і яе роля ва ўтварэнні займеннікаў марфолага-сінтаксічным спосабам.

Літаратура:


1. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.
2. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
3. Сцяшковіч, Т.Ф. Займеннік у беларускай мове / Т.Ф. Сцяшковіч. Мінск, 1977.


## Лекцыя 6

**Дзеяслоў як часціна мовы.**

## Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў

| | |
|---|---|
| Абсалютнае/адноснае ўжыванне часу | спражэнне дзеяслова, рознаспрагальныя дзеясловы |
| Аднатрывальныя, двухтрывальныя дзеясловы | Безасабовыя дзеясловы |
| Безасабова-прдыкатыўныя словы | Асновы дзеяслова |
| Безасабовыя дзеясловы | Асоба дзеяслова |
| Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова | Асабовыя дзеясловы |
| Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова | Незваротныя дзеясловы |
| Зваротнасць дзеяслова, тыпы зваротнасці | Атрыбутыўныя формы дзеяслова |
| Інфінтіыў | Мадальныя словы |
| Пераходныя/непераходныя дзеясловы | Лад дзеяслова |
| Спрагальныя формы дзеяслова | Неспрагальныя формы дзеяслова |
| Стан дзеяслова | Дзеясловы-звязкі(непаўназначныя дзеясловы) |
| Трыванне дзеяслова, трывальная пара | Прадуктыўныя/ непрадуктыўныя класы дзеяслова |
| Час дзеяслова, даўномінулы час | Парадыгма дзеяслова |

1. Асаблівасці семантыкі, граматычная адметнасць і роля ў маўленні дзеяслова як носьбіта працэсуальнай прыметы.
2. Граматычныя катэгорыі і граматычныя формы дзеяслова.

3. Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў), яе ўтварэнне, граматычнае значэнне, марфалагічныя адзнакі і сінтаксічныя функцыі. Інфінітыў як назва дзеяння.
4. Асновы дзеяслова: інфінітыва і цяперашняга (будучага простага) часу. Спосабы вызначэння асноў дзеясловаў. Роля асноў дзеясловаў ва ўтварэнні дзеяслоўных формаў.
5. Пераходныя (прама пераходныя і ўскосна пераходныя) і непераходныя дзеясловы, асаблівасці іх семантыкі і спалучэння са склонавымі формамі назоўніка.

Літаратура:


1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
2. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.
3. Васілеўскі, М.С. Прадуктыўныя тыпы дзеясловаў у сучаснай беларускай мове / М.С. Васілеўскі . – Мінск, 1970.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск, 1997.
5. Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. Мінск, 1968.


**Лекцыя7**

## Сістэма катэгорый і форм дзеяслова.

1. Граматычныя катэгорыі дзеяслова.
2. Спражэнне дзеясловаў.
3. Дзеепрыметнік як дзеяслоўна-іменная форма. Граматычная характарыстыка дзеепрыметнікаў. Суадноснасць дзеепрыметнікаў з дзеясловамі і прыметнікамі. Адметнасць утварэння і ўжывання дзеепрыметнікаў у СБЛМ.
4. Дзеепрыслоўе як дзеяслоўна-прыслоўная форма. Граматычная характарыстыка дзеепрыслоўяў. Суадноснасць дзеепрыслоўяў з дзеясловамі і прыслоўямі. Адметнасць утварэння і ўжывання дзеепрыслоўяў у СБЛМ.

Літаратура:


6. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
7. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.
8. Васілеўскі, М.С. Прадуктыўныя тыпы дзеясловаў у сучаснай беларускай мове / М.С. Васілеўскі . – Мінск, 1970.
9. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск, 1997.
10. Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. Мінск, 1968.


**Лекцыя 8**

**Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы.**

1. Семантыка-камунікатыўныя асаблівасці і граматычная адметнасць прыслоўяў як слоў са значэннем прыметы дзеяння ці прыметы прыметы.
2. Тыпы прыслоўяў у залежнасці ад характару выражэння лексічнага значэння: знамянальныя і займеннікавыя прыслоўі. Групы займеннікавых прыслоўяў.
3. Лексіка-граматычныя разрады прыслоўяў.
4. Ступені параўнання якасных прыслоўяў, іх утварэнне і ўжыванне. Прыслоўі са значэннем ацэнкі і меры якасці.

5. Пытанне аб безасабова-прэдыкатыўных словах (словах катэгорыі стану) у лінгвістычнай літаратуры. Безасабова-прэдыкатыўныя словы як асобны лексіка-граматычны клас, іх семантычныя, марфалагічныя, словаўтваральныя, сінтаксічныя адметнасці.

Літаратура:


1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
2. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.
3. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск, 1997.
4. Шуба, П.П. Прыслоўе ў беларускай мове: Марфалагічны нарыс / П.П. Шуба. Мінск, 1962.


## Лекцыя 9

**Непаўназначныя часціны мовы.**

**1. Службовыя часціны мовы.**

1. **Прыназоўнік.** Прыназоўнік як службовая часціна мовы, функцыя ў маўленні. Разрады прыназоўнікаў паводле будовы, спосабу ўтварэння (паходжання).
2. **Злучнік.** Злучнік як службовая часціна мовы, роля ў маўленні. Класіфікацыя злучнікаў паводле іх паходжання, саставу, спосабу ўжывання і функцыянальнага значэння.
3. **Звязкі.** Пытанне аб звязках у лінгвістычнай літаратуры. Пераход у разрад звязак дзеясловаў з аслабленым значэннем. Тыпы звязак паводле лексіка-граматычнага значэння (абстрактныя (незнамянальныя), паўабстрактныя (паўзнамянальныя), знамянальныя).

**2. Часціцы.** Семантычныя і граматычныя адзнакі часціц. Разрады часціц паводле паходжання, функцыянальнага значэння і марфалагічнага складу.

**Мадальныя словы.** Пытанне аб мадальных словах у мовазнаўстве. Сінтаксічная аснова выдзялення мадальных слоў у асобную групу. Месца мадальных слоў у сістэме часцін мовы. Адрозненне мадальных слоў ад слоў іншых часцін мовы. Разрады мадальных слоў паводле значэння, іх роля ў тэксце.

**Выклічнікі.** Месца выклічнікаў у сістэме часцін мовы. Разрады выклічнікаў.

**Гукаперайманні.** Гукапераймальныя словы, іх функцыя ў тэксце. Гукаперайманні, іх функцыі ў сказе і тэксце. Падабенства і адрозненне гукаперайманняў ад выклічнікаў. Пытанне аб статусе гукаперайманняў як лексічных адзінак (слоў). Лексічная, марфалагічная і сінтаксічная характарыстыка гукаперайманняў.

Літаратура:


1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
2. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.
3. Киселёв, И.А. Частицы в современных восточнославянских языках / И.А. Киселёв. Минск, 1976.
4. Шуба, П.П. Прыназоўнік у беларускай мове / П.П. Шуба. Мінск., 1971.
5. Шуба, П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П. Шуба. Мінск, 1993.

## 3.Тэматыка практычных заняткаў

### Практычныя заняткі 1

### Назоўнік як часціна мовы.

1. Катэгорыі роду, ліку і склону назоўніка. З гісторыі пытання.
2. Катэгорыя роду назоўнікаў. Пытанне аб назоўніках агульнага роду ў беларускай мове. Граматычны род абрэвіятур. Род марфалагічна нязменных назоўнікаў. Разыходжанні ў граматычным родзе некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.
3. Словазменная парадыгма назоўніка.
4. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі: разыходжанні паміж беларускай і рускай мовамі.
5. Правапіс канчаткаў назоўнікаў усіх тыпаў скланення ў адзіночным і множным ліку.

Літаратура:

1. Беларуская мова: хрэстаматыя / Аўт.-склад. З.І. Бадзевіч і інш. Мінск, 2005.
2. Бурак, Л.І., Красней, В.П., Лазоўскі, У.М. Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі / Л.І. Бурак, В.П. Красней, У.М. Лазоўскі. Мінск, 1989.
3. Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу: для студэнтаў філал. фак. / Аўт.-склад.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. Мінск, 2005.
4. Наркевіч А.І. Практычны курс сучаснай беларускай мовы / А.І. Наркевіч. – Мінск, 1992.
5. Наркевіч, А.І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. Мінск, 1976.

### Практычныя заняткі 2

### Прыметнік як часціна мовы.

1. Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў іншы.
2. Ступені параўнання якасных прыметнікаў: іх значэнне, утварэнне.
3. Формы прыметнікаў са значэннем ацэнкі і меры якасці.
4. Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Варыянтнасць склонавых канчаткаў прыметнікаў.

Літаратура:

1. Булахаў, М.Г. Прыметнік у беларускай мове / М.Г. Булахаў. Мінск, 1964.
2. Лепешаў, І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік / І.Я. Лепешаў. Гродна, 2002.
3. Наркевіч А.І. Практычны курс сучаснай беларускай мовы / А.І. Наркевіч. – Мінск, 1992.

**Практычныя заняткі 3**

**Дзеяслоў**

1. Граматычныя катэгорыі і граматычныя формы дзеяслова.
2. Спосабы вызначэння асноў дзеясловаў. Роля асноў дзеясловаў ва ўтварэнні дзеяслоўных формаў.
3. Пераходныя (прама пераходныя і ўскосна пераходныя) і непераходныя дзеясловы, асаблівасці іх семантыкі і спалучэння са склонавымі формамі назоўніка.
4. Асаблівасці ўтварэння суадносных (карэлятыўных) трывальных пар деясловаў. Аднатрывальныя і двухтрывальныя дзеясловы.
5. Поўная і няпоўная парадыгма дзеяслова.

Літаратура:


1. Бурак, Л.І., Красней, В.П., Лазоўскі, У.М. Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі / Л.І. Бурак, В.П. Красней, У.М. Лазоўскі. Мінск, 1989.
2. Васілеўскі, М.С. Прадуктыўныя тыпы дзеясловаў у сучаснай беларускай мове / М.С. Васілеўскі . – Мінск, 1970.
3. Шуба, П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. Мінск, 1968.
4. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. Мінск, 1987.


**Практычныя 4**

**Дзеепрыметнік**

1. Семантычная, граматычная і сінтаксічная суадноснасць дзеепрыметнікаў з дзеясловамі і прыметнікамі.

2. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, цяперашняга і прошлага часу, іх значэнні, спосабы ўтварэння, асаблівасці ўжывання ў сучаснай беларускай мове (у параўнанні з рускай).

3. Пераходнасць/непераходнасць дзеясловаў і асаблівасці ўтварэння дзеепрыметнікаў розных разрадаў.

4. Поўныя і кароткія формы дзеепрыметнікаў залежнага стану і іх ужыванне. Ад’ектывацыя і субстантывацыя дзеепрыметнікаў.

Літаратура:


1. Бурак, Л.І., Красней, В.П., Лазоўскі, У.М. Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі / Л.І. Бурак, В.П. Красней, У.М. Лазоўскі. Мінск, 1989.
2. Граматыка беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1962.
3. Лукашанец, А.А. Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. Мінск, 2001.


**Практычныя 5**

**Дзеепрыслоўе**

1. Суадноснасць дзеепрыслоўяў з дзеясловамі і прыслоўямі.

2. Дзеепрыслоўе і інфінітыў. Супрацьпастаўленне дзеепрыслоўяў спрагальным (асабовым) формам дзеяслова.
3. Граматычныя катэгорыі дзеепрыслоўяў. Утварэнне дзеепрыслоўяў незакончанага і закончанага трывання.
4. Ужыванне дзеепрыслоўяў у сучаснай беларускай літаратурнай мове.
5. Адвербіялізацыя дзеепрыслоўяў.

**Літаратура:**

1. Бурак, Л.І., Красней, В.П., Лазоўскі, У.М. Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі / Л.І. Бурак, В.П. Красней, У.М. Лазоўскі. Мінск, 1989.
2. Граматыка беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1962.
3. Лукашанец, А.А. Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. Мінск, 2001.

## Практычныя 6

## Прыслоўе як часціна мовы. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Мадальныя словы.

1. Ступені параўнання (вышэйшая і найвышэйшая) якасных прыслоўяў, іх утварэнне і ўжыванне. Суадноснасць ступеней параўнання якасных прыслоўяў і ступеней параўнання якасных прыметнікаў.
2. Спосабы ўтварэння прыслоўяў. Лексіка-сінтаксічны і марфалагічна-сінтаксічны спосабы ўтварэння прыслоўяў.
3. Пытанне аб безасабова-прэдыкатыўных словах (словах катэгорыі стану) у лінгвістычнай літаратуры. Безасабова-прэдыкатыўныя словы як асобны лексіка-граматычны клас, іх семантычныя, марфалагічныя, словаўтваральныя, сінтаксічныя адметнасці. Безасабова-прэдыкатыўныя словы і прыслоўі: агульныя і адметныя адзнакі.
4. Прыслоўі і мадальныя словы.
5. Пытанне аб мадальных словах у мовазнаўстве. Сінтаксічная аснова выдзялення мадальных слоў у асобную групу. Месца мадальных слоў у сістэме часцін мовы.

Літаратура:

1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
2. Граматыка беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1962.
3. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск, 1997.

## 4. Пытанні да заліку

1. Граматыка як навука, асноўныя аб'екты яе вывучэння. Сувязь граматыкі з фанетыкай і лексікалогіяй.

2. Суадносіны паміж лексічным і граматычным значэннямі. Граматычнае значэнне і яго асноўныя крытэрыі. Граматычная катэгорыя, граматычная форма. Сродкі і спосабы выражэння граматычных формаў. Сінтэтычны і аналітычны лад мовы.

3. Марфалогія. Класіфікацыйныя ўласцівасці часцін мовы.

4. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Сістэма часцін мовы. Знамянальныя і незнамянальныя словы. Марфалагічны аналіз.

5. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць назоўніка як носьбіта значэння прадметнасці. Назоўнік і яго лексіка-граматычныя разрады. Іх марфалагічная залежнасць ад семантыкі слова.

6. Граматычныя катэгорыі роду, ліку і склону назоўнікаў і іх выражэнне. Значэнне і сродкі выражэння катэгорыі роду назоўнікаў. Сістэма склонаў назоўнікаў у сучаснай беларускай мове, значэнні склонаў.

7. Скланенне назоўнікаў. Асноўныя тыпы скланення назоўнікаў. Варыянтнасць канчаткаў у склонавай сістэме назоўнікаў і і х характарыстыка. Цяжкія выпадкі ўжывання канчаткаў назоўніка. Субстантывацыя.

8. I скланенне. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў 1 скланення (мужчынскага і ніякага роду) у адзіночным і множным ліку.

9. II скланенне. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў II скланення (жаночага роду на –а, -я) у адзіночным і множным ліку. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў агульнага і мужчынскага роду на -а, -я ў адзіночным і множным ліку.

10. III скланенне. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў III скланення ў адзіночным і множным ліку. Рознаскланяльныя назоўнікі і іх групы. Асаблівасці склонавых канчаткаў рознаскланяльных назоўнікаў у адзіночным і множным ліку.

11. Скланенне назоўнікаў, якія паходзяць ад прыметнікаў і дзеепрыметнікаў. Скланенне назоўнікаў pluralia tantum. Нескланяльныя назоўнікі.

12. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць прыметніка як носьбіта непрацэсуальнай прыметы. Функцыянальная характарыстыка прыметніка. Асноўныя катэгарыяльныя значэнні і лексіка-граматычныя разрады.

13. Якасныя прыметнікі. Поўныя, кароткія і сцягнутыя (усечаныя) формы, шляхі іх распазнавання. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Сінтэтычныя і аналітычныя формы ступеней параўнання. Суплетывізм.

14. Адносныя прыметнікі. Функцыянальныя асаблівасці.

15. Скланенне прыметнікаў. Утварэнне прыметнікаў. Ад'ектывацыя.

16. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць лічэбнікаў як слоў з колькасна-лікавымі значэннямі. Разрады лічэбнікаў паводле значэння, іх спалучальнасць з назоўнікамі.

17. Колькасныя лічэбнікі і іх групы. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі.

18. Зборныя лічэбнікі. Парадкавыя лічэбнікі. Дробавыя лічэбнікі.

19. Скланенне лічэбнікаў. Тыповыя памылкі ва ўжыванні. Абазначэнне прыблізнай і няпэўнай колькасці.

20. Разнастайнасць значэнняў і функцыі займеннікаў. Разрады займеннікаў па значэнні і па суадносінах з іншымі часцінамі мовы.

21. Асаблівасці скланення займеннікаў паводле разрадаў.

## 5. Экзаменацыйныя пытанні

1. Граматыка як навука, асноўныя аб'екты яе вывучэння. Сувязь граматыкі з фанетыкай і лексікалогіяй.

2.Суадносіны паміж лексічным і граматычным значэннямі. Граматычнае значэнне і яго асноўныя крытэрыі. Граматычная катэгорыя, граматычная форма. Сродкі і спосабы выражэння граматычных формаў. Сінтэтычны і аналітычны лад мовы.

3.Марфалогія. Класіфікацыйныя ўласцівасці часцін мовы.

4.Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Сістэма часцін мовы. Знамянальныя і незнамянальныя словы. Марфалагічны аналіз.

5.Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць назоўніка як носьбіта значэння прадметнасці. Назоўнік і яго лексіка-граматычныя разрады. Іх марфалагічная залежнасць ад семантыкі слова.

6.Граматычныя катэгорыі роду, ліку і склону назоўнікаў і іх выражэнне. Значэнне і сродкі выражэння катэгорыі роду назоўнікаў. Сістэма склонаў назоўнікаў у сучаснай беларускай мове, значэнні склонаў.

7.Скланенне назоўнікаў. Асноўныя тыпы скланення назоўнікаў. Варыянтнасць канчаткаў у склонавай сістэме назоўнікаў і і х характарыстыка. Цяжкія выпадкі ўжывання канчаткаў назоўніка. Субстантывацыя.

8.I скланенне. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў 1 скланення (мужчынскага і ніякага роду) у адзіночным і множным ліку.

9.II скланенне. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў II скланення (жаночага роду на –а, -я) у адзіночным і множным ліку. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў агульнага і мужчынскага роду на -а, -я ў адзіночным і множным ліку.

10. III скланенне. Асаблівасці склонавых канчаткаў назоўнікаў III скланення ў адзіночным і множным ліку. Рознаскланяльныя назоўнікі і іх групы. Асаблівасці склонавых канчаткаў рознаскланяльных назоўнікаў у адзіночным і множным ліку.

11. Скланенне назоўнікаў, якія паходзяць ад прыметнікаў і дзеепрыметнікаў. Скланенне назоўнікаў pluralia tantum. Нескланяльныя назоўнікі.

12. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць прыметніка як носьбіта непрацэсуальнай прыметы. Функцыянальная характарыстыка прыметніка. Асноўныя катэгарыяльныя значэнні і лексіка-граматычныя разрады.

13. Якасныя прыметнікі. Поўныя, кароткія і сцягнутыя (усечаныя) формы, шляхі іх распазнавання. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Сінтэтычныя і аналітычныя формы ступеней параўнання. Суплетывізм.

14. Адносныя прыметнікі. Функцыянальныя асаблівасці.

15. Скланенне прыметнікаў. Утварэнне прыметнікаў. Ад'ектывацыя.

16. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць лічэбнікаў як слоў з колькасна-лікавымі значэннямі. Разрады лічэбнікаў паводле значэння, іх спалучальнасць з назоўнікамі.

17. Колькасныя лічэбнікі і іх групы. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі.

18. Зборныя лічэбнікі. Парадкавыя лічэбнікі. Дробавыя лічэбнікі.

19. Скланенне лічэбнікаў. Тыповыя памылкі ва ўжыванні. Абазначэнне прыблізнай і няпэўнай колькасці.

20. Разнастайнасць значэнняў і функцыі займеннікаў. Разрады займеннікаў па значэнні і па суадносінах з іншымі часцінамі мовы.

21. Асаблівасці скланення займеннікаў паводле разрадаў.

22. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць дзеяслова як носьбіта працэсуальнай прыметы дзеяння. Граматычныя катэгорыі і граматычныя формы дзеяслова.Інфінітыў як неспрагальная форма дзеяслова.

23. Пераходныя і непераходныя, зваротныя і незваротныя дзеясловы.

24. Катэгорыя стану. Пытанне пра стан дзеяслова ў сучаснай лінгвістыцы. Катэгорыя трывання дзеяслова. Катэгорыя ладу дзеяслова. Катэгорыя часу дзеяслова.

25. Катэгорыя асобы дзеяслова. Безасабовыя дзеясловы.

26. Спражэнне дзеяслова. Рознаспрагальныя дзеясловы.

27. Дзеепрыметнік як асобая дзеяслоўна-іменная форма. Утварэнне дзеепрыметнікаў. Ад'ектывацыя.

28. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай мове.

29. Дзеепрыслоўе, яго граматычная характарыстыка. Граматычныя катэгорыі дзеепрыслоўяў. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўя ў сучаснай беларускай мове. Адвербіялізацыя дзеепрыслоўяў.

30. Семантыка-камунікатыўная і граматычная адметнасць прыслоўяў як слоў са значэннем прыметы дзеяння.

31. Разрады прыслоўяў паводле значэнняў. Ступені параўнання якасных прыслоўяў і іх утварэнне. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці.

32. Спосабы ўтварэння прыслоўяў. Адвербіялізацыя. Адрозненне прыслоўяў з прыстаўкамі ад назоўніка з прыназоўнікамі. Правапіс прыслоўяў.

33. Агульная характарыстыка прэдыкатываў. Дыскусійныя пытанні ў лінгвістыцы аб мэтазгоднасці вылучэння катэгорыі стану як самастойнай часціны мовы. Словаўтварэнне прэдыкатываў.

34. Агульная характарыстыка службовых слоў, іх класіфікацыя. Прыназоўнікі, злучнікі і часціцы як службовыя часціны мовы.

35. Функцыянальная характарыстыка прыназоўніка. Разрады прыназоўнікаў. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў. Ужыванне прыназоўнікаў з ускоснымі склонамі назоўнікаў.

36. Семантычныя і граматычныя адзнакі злучнікаў. Класіфікацыя злучнікаў. Злучнікі і злучальныя словы.

37. Семантычныя і граматычныя адзнакі часціц. Разрады часціц паводле іх функцыянальнага значэння і марфалагічнага складу. Пераход у часціцы слоў з іншых часцін мовы.

38. Пытанне аб мадальных словах. Сінтаксічная аснова выдзялення мадальных слоў у асобную групу. Словаўтваральная і семантычная сувязі мадальных слоў з іншымі часцінамі мовы. Разрады па значэнні.

39. Функцыянальная характарыстыка выклічнікаў і гукаперайманняў. Цяжкасці размежавання выклічнікаў і гукаперайманняў.

## 6. Літаратура:


1. Беларуская граматыка. У 2 ч. Ч.1. Мінск, 1985.
2. Беларуская мова. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Марфалогія. Сінтаксіс. Пунктуацыя / Пад. рэд. Л.М. Грыгор'евай. Мінск, 1994.
3. Беларуская мова: хрэстаматыя / Аўт.-склад. З.І. Бадзевіч і інш. Мінск, 2005.
4. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
5. Бурак, Л.І., Красней, В.П., Лазоўскі, У.М. Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі / Л.І. Бурак, В.П. Красней, У.М. Лазоўскі. Мінск, 1989.
6. Граматыка беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1962.
7. Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу: для студэнтаў філал. фак. / Аўт.-склад.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. Мінск, 2005.
8. Кароткая граматыка беларускай мовы. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. Ч. 1. Мінск, 2007.
9. Наркевіч А.І. Практычны курс сучаснай беларускай мовы / А.І. Наркевіч. – Мінск, 1992.
10. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. Мінск, 1996.
11. Шуба, П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія / П.П. Шуба. Мінск, 1987.
12. Булахаў, М.Г. Прыметнік у беларускай мове / М.Г. Булахаў. Мінск, 1964.
13. Васілеўскі, М.С. Прадуктыўныя тыпы дзеясловаў у сучаснай беларускай мове / М.С. Васілеўскі . – Мінск, 1970.
14. Вярхоў, П.В. Лічэбнік у беларускай мове (параўнальна з рускай і ўкраінскай мовамі) / П.В. Вярхоў. Мінск, 1961.
15. Жыдовіч, М.А. Назоўнік у беларускай мове / М.А. Жыдовіч. Мінск, 1969.
16. Киселёв, И.А. Частицы в современных восточнославянских языках / И.А. Киселёв. Минск, 1976.
17. Лепешаў, І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік / І.Я. Лепешаў. Гродна, 2002.
18. Лукашанец, А.А. Словаўтварэнне і граматыка / А.А. Лукашанец. Мінск, 2001.
19. Наркевіч, А.І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы / А.І. Наркевіч. Мінск, 1976.
20. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. М.С. Яўневіча. Мінск, 1997.
21. Сцяшковіч, Т.Ф. Займеннік у беларускай мове / Т.Ф. Сцяшковіч. Мінск, 1977.
22. Шуба, П.П. Дзеяслоў у беларускай мове / П.П. Шуба. Мінск, 1968.
23. Шуба, П.П. Прыслоўе ў беларускай мове: Марфалагічны нарыс / П.П. Шуба. Мінск, 1962.
24. Шуба, П.П. Прыназоўнік у беларускай мове / П.П. Шуба. Мінск., 1971.
25. Шуба, П.П. Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў / П.П. Шуба. Мінск, 1993.